**Шушкевіч, У.** Музыкант ахоўваў рэзідэнцыю Кармаля / У. Шушкевіч // Лепельскі край. — 2003. — 11 лістап. — С. 3.

## МУЗЫКАНТ АХОЎВАЎ РЭЗІДЭНЦЫЮ КАРМАЛЯ



*Віталь Піскуноў на ўсё жыццё свой лёс звязаў з музыкай. І не зусім звычайным чынам. Пачалося з таго, што старэйшай сястры Ларысе купілі баян. У гурток баяністаў дзяўчынцы давялося хадзіць за тры кіламетры. Адной насіць цяжкі музычны інстпрумент не хапала моцы. Таму бацькі абавязалі малого Віталіка дапамагацъ сястры. Пакуль ішлі заняткі, хлопчык прыслухоўваўся да чароўных гукаў баяна. Потым сам пачаў пакрыху рыпаць.*

Ад пасёлка Руба, дзе жыў Віталік, да Віцебска было недалёка, і бацькі аддалі сына ў гарадскую музычную школу. Хлопчыка праслухалі і прапанавалі ісці на кларнет. Згадзіўся.

Два гады двойчы на дзень Віталік тросся ў дрогкім аўтобусе па пыльнай жвіроўцы разам з клункамі старых бабуль. Далекавата, нязручна. Выспела рашэнне спыніць навучанне музыцы. Настаўнікі не хацелі губляць таленавітага вучня. Параілі ўзяць гадавы акадэмічны водпуск, адпачыць. Дапамагло. Праз год хлопчык вярнуўся, але ўжо ў клас флейты. Захапленне новым інструментам пасля васьмігодкі прывяло Віталя ў Віцебскае музычнае вучылішча набываць спецыяльнасць флейціста. Аднак у навучальнай установе не было каму іграць на ўдарных інструментах. Згадзіўся перавесціся на спецыяльнасць «Духавыя і ўдарныя інструменты». На чацвёртым курсе ажаніўся на аднакурсніцы Ларысе Шульгат, якая вучылася на харавым аддзяленні.

Спецыяльнасць Віталь атрымаў мудрагелістую: «Артыст аркестра, кіраўнік самадзейнага духавога аркестра, выкладчык дзіцячай музычнай школы па класу ударных інструментаў з кваліфікацыяй «саксафон». Як добраму навучэнцу, Піскунову прапанавалі выбіраць месца працы. З радасцю паехалі на радзіму Ларысы, у Докшыцы. Віталь пачаў кіраваць духавым аркестрам у РДК, Ларыса там жа ўладкавалася метадыстам.

Хутка Віталя забралі ў армію. Трапіў у духавы аркестр Віцебскага паветрана-дэсантнага палка. Ларыса пераехала ў Рубу, бліжэй да мужа. Пайшла працаваць у клуб «Даламіт».

Пасля заканчэння тэрміновай службы Віталю прапанавалі месца дырэктара філіяла Віцебскай музычнай школы і кватэру ў Віцебску. Аднак ён упадабаў вайсковыя дысцыпліну і парадак. Таму адмовіўся ад перспектыўнай пасады і застаўся на звыштэрміновай службе.

Мала давялося Віталю спакойна пайграць у вайсковым аркестры. Не паспеўшы атрымаць першую зарплату, 26 снежня 1979 года ён разам з аднапалчанамі прызямліўся ў Кабуле.

Музыкаў-прафесіяналаў паставілі ахоўваць рэзідэнцыю Бабрака Кармаля. Музычныя інструменты бралі ў рукі толькі на страявыя агляды, канцэрты, святы. Пасля Віталя пасадзілі на ГАЗ-66 падвозіць дэфіцытную ваду.

Тры гады сустракаў Піскуноў навагоднія святы на далёкай чужыне. За той час паспеў паляжаць з жаўтухай у шпіталі савецкага горада Чырчык і зноў вярнуцца за мяжу. У рэшце рэшт, «дабрачынная» муштра закончылася. На радзіме бліжэй за ўсё ад бацькаўшчыны «афганец» знайшоў працу ў аркестры бароўскай ракетнай брыгады. Пасяліўся ў гасцініцы. У 1983 годзе перавёз на Лепельшчыну жонку і двух сыноў.

Гадоў дзевяць жылі Піскуновы на падсяленні, перш чым атрымапі асобную кватэру. Пасля расфарміравання ракетнай часці Віталь пачаў кіраваць аркестрам Бароўскай музычнай школы. Вучыў дзяцей іграць на кларнеце. Пашыраў аркестр. У 1996 годзе калектыў атрымаў званне ўзорнага дзіцячага.

У 2002 годзе Піскуноў перайшоў працаваць кіраўніком духавога аркестра Бароўскага філіяла раённага цэнтра дзіцячай творчасці. Пачаў з нуля. Сам камплектаваў гурток.

Былы вайсковец стаў не проста вучыць дзяцей іграць на музычных інструментах ды выкладаць тэорыю і гісторыю музыкі, а ўзяўся прывіваць будучаму пакаленню любоў да роднага краю, прыроды. Гурткоўцам падабаецца хадзіць у арганізаваныя кіраўніком паходы, жыць у вайсковай палатцы, дняваліць і дзяжурыць па-армейску.

Старэйшы сын Піскуновых прайшоў пачатковае навучанне ігры на баяне, закончыў Віцебскае вышэйшае прафесійнае вучылішча народных рамёстваў, працуе майстрам на дрэваапрацоўчым прадпрыемстве ў Наваполацку. Бароўскую кватэру ўпрыгожваюць яго ўласныя мудрагелістыя вырабы з дрэва.

Малодшы Ілья ў музычнай школе навучыўся іграць на трубе. Цяпер займаецца на пятым курсе Горацкай сельгасакадэміі па спецыяльнасці «Механізацыя сельскай гаспадаркі».

Віталь Піскуноў абраны дэпутатам Бароўскага сельскага савета.

**Уладзімір Шушкевіч**

**На здымку:** ***Віталь Мікалаевіч Піскуноў***

**Фота М. Крыўца**